Віталь Цыганкоў аб асноўных выніках года (стар.4)
Сяргей Дубавец піша пра камунізм без камуністаў (стар.5)

СВАБОДА

Год заснаваньня 1902
Выходзіць з 1990
Галоўны рэдактар Ігар Гермянчук
Заснавальнік Павел Жук
Выдавец "Газэта СВАБОДА, Ltd."
Наклад 93 000
Адрас рэдакцыі:
220088, Менск, вул.Іванаўская,56
Тэл./факс 362441

29 сьнежня 1995 г. №62 Кошт свабодны

У Новы год – са старой зброяй?

Прэзідэнт Лукашэнка мае намер вынесьці на агульнанародны рэфэрэндум пытаньне аб стварэньні адзінай кантрольнай службы пры кіраўніку дзяржавы.

Гэтую ідэю Аляксандар Лукашэнка выказаў падчас нядаўняй сустрэчы з кіраўнікамі кантрольных і праваахоўных органаў. Прэзідэнта не задавальняе сітуацыя, калі ў краіне акрамя ягонай службы кантролю існуе і падпарадкаваная Вярхоўнаму Савету Кантрольная палата (КП). Аднак рэфармаваць КП сваім указам Аляксандар Лукашэнка ня мае права, паколькі палажэньне аб Кантрольнай палаце замацаванае ў Канстытуцыі. Вось і вырашыў прэзідэнт выкарыстаць выпрабаваную "зброю" ў барацьбе з Канстытуцыяй.

СІМ

«Алё, вэртыкаль?» – гаворыць «бацька»

Напярэдадні Новага года ўсе абласныя ўправы сувязі атрымалі заданьне ад прэзідэнта наладзіць яму сувязь з вэртыкальнымі структурамі на месцах.

Для гэтай мэты прызначаная высокаякасная тэлефонная станцыя (выхад на яе для іншых абанэнтаў будзе закрыты). Мусіць, Лукашэнка хоча займець ВЧ, якую меў калісьці Сталін альбо якая выкарыстоўваецца сёньня КДБ. Сувязь "бацькі" з вэртыкальшчыкамі палепшыцца, але наўрад ці гэта дапаможа выправіць эканамічную і палітычную сітуацыю ў краіне.

А.Б.

Закрылі «Голас душы»

Кіраўнік беларускага радыё Ўладзімер Ядранцаў закрыў папулярную хрысьціянскую перадачу "Голас душы", якая выходзіла ў эфір па суботах і нядзелях.

Праіснаваўшы 2 гады і 7 месяцаў, праграма мела шырокую аўдыторыю ня толькі сярод каталікоў, але і сярод прадстаўнікоў іншых канфэсіяў. Аўтар "Голасу душы" ксёндз-магістар Уладзіслаў Завальнюк не атрымаў ніякіх тлумачэньняў ад кіраўніцтва тэлерадыёкампаніі.

Уладзімер Ядранцаў сказаў карэспандэнту СВАБОДЫ, што "ўсе канфэсіі прэтэндуюць на эфірны час і атрымаюць яго пасля Новага года ў 50-хвілінная штонядзельнай перадачы". Яе канцэпцыя пакуль што не распрацаваная, але "гэта будзе больш духоўная праграма, чымсьці рэлігійная". Асноўную частку эфіру возьмуць праваслаўная канфэсія і каталіцкая (па словах Ядранцава, каталікі складаюць каля 25 працэнтаў вернікаў).

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Нараджэньне Хрыстова ў Магілёве

Нараджэньне Хрыстова ўрачыста адзначылі ў касьцёле сьв.Станіслава магілёўскія каталікі.

24 сьнежня імшу адправіў папскі нунцый Аўгустын Маркета, а 26 сьнежня – біскуп Менска-Магілёўскі кардынал Казімер Сьвёнтак.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

Бедныя, але шчасьлівыя

Па выніках сацыялагічнага апытаньня, праведзенага ў Магілёўскай вобласьці мясцовым сацыялагічным цэнтрам, ніхто ня вызначыў сябе як багатага ці забясьпечанага чалавека.

А вось беднымі і жабракамі лічаць сябе амаль 60 працэнтаў рэспандэнтаў. Самымі актуальнымі праблемамі, на думку магілёўцаў, зьяўляецца злачыннасьць (64 %), беднасьць (60 %), здароўе (50,4 %) і экалогія (47,3 %). У 20 працэнтаў апытаных, па іх словах, няма грошай, каб набыць неабходныя лекі, 70 працэнтаў непакоіцца за сваю працу ў надыходзячым годзе. Больш за дзьве трэці апытаных заявілі, што з прыемнасьцю ўзгадваюць "часы Брэжнева". Пры ўсім, аднак, амаль палова рэспандэнтаў лічыць сябе ў той ці іншай ступені сёньня шчасьлівымі людзьмі. Можа, і сапраўды, ня ў грашах шчасьце?

Іван ЗАСАДА

Пад Новы год – на вуліцу

Наваградзкія сьвяты наўрад ці будуць вясёлымі для дзесяці жыхароў інтэрнату Менскага праектнага інстытуту воднай гаспадаркі.

Згодна з рашэньнем народнага суда 27 сьнежня міліцыя распачала іх прымусовае высяленьне без прадастаўленьня іншага жыльля. У мінулую сераду трое жыхароў былі выкінутыя на мароз. Тое ж самае пагражае маладой сям'і, калі ў бліжэйшы час яна не пакіне жыльлё добраахвотна.

Выселеныя з інтэрнату рабочыя па розных прычынах ужо не працуюць у інстытуце, таму іх і высяляюць з ведамаснага інтэрнату.

Мікола ВАЙТОВІЧ

1995 год вачыма тых, хто зарабляе хлеб на навінах

1995 год быў багаты на самыя розныя падзеі. Рэдакцыя СВАБОДЫ правяла апытаньне прадстаўнікоў розных СМІ з мэтаю высьветліць, якія навіны, на думку саміх журналістаў, былі для іх самымі цікавымі, адметнымі, запамінальнымі

АЛЕСЬ ЛІПАЙ, *дырэктар інфармацыйнага агенцтва БелаПАН:*

– БелаПАН, дзякуючы нашым рэпарцёрам, перадае выдатныя навіны практычна кожны дзень. Я ня буду вяртацца ў часы мінулыя, а лепш скажу пра самую апошнюю навіну, якую на момант нашай размовы ніхто не перадаваў. Учора ўвечары (26 сьнежня) каля 17-й гадзіны два арыштаваньня, якія адбываюць пакараньне ў выпраўленча-працоўнай калоніі № 1 г.Менску, захапілі і ўтрымлівалі ў працягу 4-х гадзін дзвюх жанчын – служачых гэтай калоніі. Яны патрабавалі 10 тысяч даляраў ЗША, два пісталеты з патронамі да іх і аўтамабіль хуткай дапамогі з тым, каб на ім зьехаць. Спэцназ прыбыў, але яму не спатрэбілася займацца вызваленьнем заложнікаў, бо да таго часу (прыблізна пасьля 21-й гадзіны) гэтыя людзі самі здаліся і выпусьцілі заложнікаў.

ГАЛІНА АЙЗЕНШТАТ, *радыё "Свабода":*

– Самы сэнсацыйны момант для беларускай службы радыё "Свабода" ў гэтым годзе стаў прыход Мечыслава Грыба ў нашу менскую студыю. Я запрасіла яго прачытаць зварот да выбаршчыкаў перад другім турам галасаваньня, паколькі нацыянальная тэлерадыёкампанія адмовіла яму ў гэтым. Выпадкова ці не, але ледзь ці не на наступны дзень пасля гэтага сп.Грыб пазбавілі аховы і службовага транспарту, а Ціцянкоў даслаў яму ліст, каб старшыня Вярхоўнага Савету пакінуў жыльлё, бо яго трэба тэрмінова адрамантаваць для новага сьпікера. Зразумела, што аб усім гэтым я таксама паведаміла. Цяперашняе жыцьцё нас, журналістаў, без сэнсацый не пакідае. Між іншым у той дзень, калі па "Свабодзе" першы раз гучаў зварот сп. Грыба да выбаршчыкаў (а мы круцілі яго аж тры дні запар) у беларускую рэдакцыю ў Празе прыбег галоўны шэф усёй "Свабоды": "Няўжо і праўда, у Беларусі не даюць слова сьпікеру?" Ёсьць рэчы, якія цяжка зразумець людзям, выхаваным у іншых абставінах і каардынатах разуменьня ступеняў свабоды.

ЮРЫ НАЯРОВІЧ
"Народная газета":

– "Сьвінскі" год быў някепскім. На падзеі, сустрэчы, на журналісцкае задавальненьне. І на сум таксама. А галоўнай падзеяй, творчай удачай, для мяне было... Не, не лістападаўскае інтэрвію са следчым Пракуратуры Рэспублікі Расольскам наконт каштоўных папераў былога прэм'ера Кебіча. Лепшым матар'ялам і падзеяй быў жнівеньскі рэпартаж з залы Сьветлагорскага суда. На лаве падсудных, у клетцы – забойца і гвалтаўнік шасьці хлапчукоў Ігар Міранкоў. Доўгачаканы, жахлівы, эмацыянальны працэс.

Так атрымалася, што з журналістаў рэспубліканскіх выданьняў я быў там першы. Бадай што, першы тады і размаўляў з Міранковым.

Апярэдзіў! Гэта добра. Па-рэпарцёрску. Але, на мой погляд, і матар'ял атрымаўся моцным, "прайшоў" скрозь маю душу...

ВАЛЕРЫ РАДУЦКІ,
"Радыёфакт":

– Я б адзначыў дзьве навіны. Першая: мы, журналісты, доўга гаварылі і пераконвалі, што тагія вядомыя кампаніі, як "Тэхнапром" ды "Мыза" ніколі не падмануць людзей. І другая навіна пра тое, што нівоДны прадстаўнік БНФ не ўвайшоў у новы Вярхоўны Савет. Як будзе працаваць парламент – я не ўяўляю.

АЛЯКСАНДАР СТУПНІКАЎ
тэлекампанія НТВ:

– Самая важная апэратыўная навіна была перададзеная мною ў Маскву ў сувязі з гібельлю амэрыканскага паветранага шару ў небе Беларусі. Я ня меў магчымасьці адразу перадаць "малюнак," як тэлевізійны журналіст, інфармацыя тады прагучала па тэлефоне. Пасьля выпуску, ў той жа вечар, сталі званіць для ўдакладненьняў калегі з Германіі і Польшчы – ім паведамілі аб гэтым з Масквы тыя, хто глядзеў НТВ. Іншая інфармацыя аб гэтым з Беларусі была толькі на наступны дзень. Гэты ж выпадак лічу і самым вялікім сваім прафэсійным "праколам" за год. Замест таго, каб адразу ехаць у раён здарэньня пад Берасьце, я паччаў тэлефанаваць па інстанцыях, прасіць дазволу і распытваць пра ўмовы рэжыму пропуску на месца трагедыі. Марна страціў час на імпатэнтных дзяржаўных чыноўніках. А сам "малюнак" з месца здарэньня зьнялі тады пазьней, на наступны дзень, калегі з Берасьця. Таму я гэтак жа шчыра віншую іх, як і ганю сябе за тое, што адбылося.

ВАЛЯНЦІН ЖДАНКО
"Белорусская деловая газета":

– Увосень, якраз у разгар абвастрэньня адносінаў паміж прэзідэнтам і Канстытуцыйным судом, БДГ паведаміла пра дзіўную аварыю, у якую трапіў аўтамабіль В.Ціхіні на перакрыжаваньні вул. Камсамольскай з пр.Скарыны. Гэты выпадак застаўся па-за ўвагай іншых сродкаў масавай інфармацыі. Між тым, гэта было вельмі загадкавае здарэньне, якое, дарэчы, так і засталося нерасьсьледаваным. Той вадзіцель, які спраакаваў аварыю, з месца здарэньня зьнік. Многія дасьведчаныя людзі сьцьвярджаюць, што гэта была невыпадковая аварыя.

УЛАДЗІМЕР ПАЦ,
уласны карэспандэнт Польскага радыё:

– Наведаньне першага ў Беларусі сэкс-шопа, які знаходзіцца ў Менску на вуліцы Карбышава, магчыма не было падзеяй года, але засталося ў памяці. Адзін з маіх знаёмых польскіх журналістаў гаворыць, што краіну і людзей трэба ацэньваць па сьметніках, прыбіральнях і сэксшопах – гэта тыя месцы, якія некаторымі людзьмі ўспрымаюцца сарамліва. Менскія сьметнікі – мы ўсе ведаем якія, з прыбіральнямі ў Беларусі таксама ўсялякае бывае. Беларускі сэкс-шоп на Карбышава на фоне падобных прыбыткаў у Заходняй Эўропе прэзэнтуецца не найгорш. Зьдзівілі мяне толькі цэны, асабліва неабходнасьць аплаты за права на ўваход у залу з электрамэханічнымі прыладамі, якія выкарыстоўваюцца для дасягненьня задавальненьня.

Мікола ГРЫНЯВІЦКІ

Не крадзіце курэй!

Днямі ў Віцебску закончыўся судовы працэс па справе аб крадзяжы на бройлернай фабрыцы 2 (дзьвюх) курэй.

Злодзею прысудзілі 2 гады і 10 месяцаў з канфіскацыяй маёмасьці. Можна лічыць, што яму пашчасьціла, бо пракурор патрабаваў 4 гады турмы.

Гэты выпадак нагадаў мне адну гісторыю – як улетку 1994 года пракладвалі асфальтавую дарогу да віцебскага садаводчага кааператыву "Зодчие". Для гэтага было фактычна скрадзена будматар'ялаў на дзесяткі мільёнаў рублёў. І нікога не судзілі. Вінаватых пазбавілі прэміяльных, а грошы былі "сьпісаныя" на пракладку калгаснай дарогі Лёзна – Янавічы.

Можа, уся рэч у тым, што асфальт той сканчаецца акурат каля дачы старшыні абласнога савету Ўладзімера Кулакова...

Уладзімер СЯРГУН

Тэатр застаўся бяз гербу

Напярэдадні Каляд у сталічным тэатры імя Янкі Купалы нехта выкраў лукашэнкаўскія герб і сьцяг.

Гэтая сімволіка зьявілася тут згодна з распараджэньнем кіраўніка прэзідэнцкай адміністрацыі Міхаіла Мясьніковіча. Герб і сьцяг вывесілі на самым відным месцы – пры ўваходзе ў глядзельную залу. Відаць, адміністрацыя меркавала, што ў гледачоў, якія праходзяць ў партэр, павінен ствараецца асабліва ўрачысты настрой. Аднак зламысьнікі пры невядомых абставінах выкралі сімволіку. Супрацоўнікі дзяржбясьпекі, якія апытвалі акцёраў і рэжысэраў тэатра пасьля гэтага інцыдэнту, пакуль не знайшлі ні злодзея, ні скрадзеныя каштоўнасьці.

А.Д.

Віншуем усіх чытачоў газэты
СВАБОДА
з Новым годам і Калядамі!

Наступны нумар СВАБОДЫ выйдзе 10-11 студзеня. Адміністрацыя прэзідэнта Лукашэнкі не дае дазволу на выпуск нашай газэты ў Аршанскай друкарні. Нам патрэбна дзесяць дзён, каб наладзіць выпуск за мяжой.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Калі абутку шмат – можна пастаяць

Перад Новым годам спынілася Магілёўская абутковая фабрыка.

Стаяць будзе, калі не пашанцуе, да вясны. Цяпер 60 000 пар абутку ляжыць на складах – ніхто не купляе, бо дарагі і ня лепшай якасьці.Тым часам насядаюць крэдыторы, патрабуючы вярнуць чатыры мільярды пазыкі. А дзе іх узяць?! Адміністрацыя сьцьвярджае, што пры сёньняшніх падатках фабрыка працаваць ня здольная. Калі летам урад панізіў для прадпрыемстваў падатак на дабаўленую вартасьць на 10 %, то паступленьні ў бюджэт павысіліся ў 26 разоў. Але цяпер дзейнічаюць ранейшыя правілы, і 900 работнікаў фабрыкі сустракаюць Новы год "схаванымі" беспрацоўнымі.

У міліцыі «сьвяткуюць» па-свойму

Напярэдадні Новага года начальнік магілёўскай міліцыі палкоўнік Лапацік распарадзіўся аб увядзеньні для міліцэйскіх афіцэраў 12-гадзіннага рабочага дня і 6 дзённага працоўнага тыдня. Вядома, што вобласьць лідуе па ўзроўні злачыннасьці ў Беларусі.

Іван ЗАСАДА

Які народ – такое і войска

Магілёўская ваенная пракуратура канстатуе рост злачыннасьці сярод вайскоўцаў.

У той час, як у іншых абласьцях колькасьць гэтай катэгорыі правапарушэньняў падае, на Магілёўшчыне яна ўзрасла ў 1995 годзе на 22 працэнты. Асабліва вызначыліся служачыя-кантрактнікі і вайскоўцы ўнутраных войскаў.

Мэляіратары перайшлі на лапшу з малаком

Мсьціслаўская ПМК-94 мэліярацыі вымушаная мяняць профіль, каб выжыць у сёньняшніх умовах.

Мэліяратары пачалі выраблаць лапшу ды макароны, а таксама занялiся продажам малака ды масла са сваёй фэрмы.

Чацьвёртая ахвяра

У Магілёве выяўлены яшчэ адзін хворы на СНІД.

Гэта мясцовы жыхар, якому няма яшчэ трыццаці гадоў. Ён ужо чацьвёрты носьбіт сьмяротнага вірусу, зарэгістраваны сёлета на Магілёўшчыне. Мэдыкі непакояцца, што ў бліжэйшыя гады колькасьць інфіцыяваных можа рэзка ўзрасьці.

Сымон ГЛАЗШТЭЙН

На мяжы скароцяцца чэргі

У Берастаўіцкім раёне на просьбу палякаў быў зачынены праезд грузавога транспарту на беларуска-польскай мяжы.

Ён быў зачынены з прычыны капітальнага рамонту маста. Планавалася, што працы будуць працягвацца год, але скончылі іх значна раней. Дзякуючы датэрміноваму заканчэньню рамонту скароцяцца чэргі аўтамабіляў у Гарадзенскім раёне.

А.Б.

Палітычныя прагнозы малююць нам неверагодныя паляўнічыя сюжэты.

Быццам бы ў новым годзе нас чакаюць далейшыя "адстрэлы" кандыдатаў у сьпікеры, "аблавы" на дэмакратычную апазіцыю ці "аблога" прэзідэнцкай "бярлогі" чырвонай парламанцкай большасьцю. І гэтак далей. Затое прагноз надвор'я прадказвае, што ў бліжэйшыя дні палітыкі будуць адпачываць і вельмі актыўна. Мароз, сонца, сьнег – выдатныя ўмовы правесьці дзень альбо нават тыдзень са стрэльбай у лесе. Праўда, дасьледваньне, праведзенае СВАБОДАЙ сярод вядомых палітычных дзеячоў-дэмакратаў, высьветліла, што сапраўдных паляўнічых сярод іх знайсьці цяжэй за "Пагоню" ў кабінэце вэртыкальшчыка. І ўсё ж, каб яны зусім ня мелі дачыненьня да паляўнічай справы, такога быць ня можа! Вось глядзіце.

Качка, два дзікі, парсюк і заяц-русак

Вось і ўсе трафэі паляўнічых-дэмакратаў

Станіслаў Шушкевіч паляваў адзін раз у жыцьці, калі вучыўся на трэцім курсе ўнівэрсітэту. Хаця тое паляваньне праходзіла ў вельмі экзатычных умовах – плылі па Бярэзіне ў лодцы і стралялі па качках, але яно не захапіла будучага старшыню ВС РБ, а пакінула толькі кепскія ўспаміны: "Потым ня ведаў, што рабіць з забітай качкай". Другі раз Шушкевіч быў сьведкам неверагоднага паляваньня ў сьнежні 1991 года ў Віскулях. Тады прэм'ер Украіны Фокін забіў дзіка, якога ўся кампанія белавескіх змоўшчыкаў з задавальненьнем зьела пад зуброўку. Па словах Шушкевіча, ініцыятарам таго паляваньня быў прэзідэнт Украіны Краўчук, пра якога егеры жартавалі, што ён страляў так добра, што трапіў у вяроўку, якой быў прывязаны ягоны дзік, і таму застаўся без трафэю.

Генадзь Карпенка сам ніколі не паляваў, але калі быў мэрам Маладэчна арганізоўваў паляваньні для гасьцей з італійскага гораду-пабрацiму Каталікі (180 км ад Вэнэцыі, па дадзеных Карпенкі). Мэр "курыраваў" атрыманьне "каталікамі" ліцэнзіі на адстрэл жывёлы, рэгістраваньне іхных стрэльбаў, а потым забясьпечваў праверку мяса забітага дзіка. Вось таму пачаставацца так і не пашчасьціла, бо італійцы павезьлі трафэй бліжэй да шчодрай на спакусы Вэнэцыі. Пераважыўшы ўсе гэтыя пакуты, сп.Генадзь Карпенка сказаў паляваньню рашучае "не" і слова сваё трымае, нягледзячы на шматлікія прапановы.

Іосіф Сярэдзіч таксама расчараваўся ў паляваньні, але было гэта значна раней, у часы, калі савецкі народ дружна прызвычайваўся да гэтага карыснага занятку. Супрацоўніка "Сельскай газеты" Іосіфа Сярэдзіча, які прыехаў у камандзіроўку ў Сьвіслацкі раён на Гарадзеншчыну, запрасілі на беларускае "сафары" мясцовы дырэктар саўгаса. Цяпер Сярэдзіч ня можа бяз дрыжыкаў узгадваць тое паляваньне: "Колькі расстрэлялі патронаў, колькі спалілі бэнзіну, выпілі гарэлкі, і ўсё дзеля таго, каб забіць маленькага лясного парсючка!" Гэта з тых часоў сп.Сярэдзіч прынцыпова выступае супраць паляваньня, прычым свой гуманізм ён распаўсюджвае ня толькі на жывёлаў, але і на некаторых дырэктараў саўгасаў: "Трэба ратаваць як чацьвяраногіх, так і двуногіх, бо яны таксама ў небясьпецы".

Генадзь Грушавы ў дзяцінстве быў ад паляваньня ў захапленьні: стосамі вывучаў спэцыяльную літаратуру, рыхтаваўся да стральбы па бягучым дзіку, марыў аб вялікай паляўнічай будучыні. Але вырас і скіраваў сваю энэргію на іншыя рэчы. Хаця на агнявую падрыхтоўку не забыўся – рэгулярна страляе ня толькі з паляўнічай зброі. І часьцей за ўсё – у "дзесятку". Нядаўна ён трымаў у руках кольт 44-га калібра, з якога можна забіць ня тое што качку, а нават слана. Пасьля гэтага Генадзь Грушавы прыйшоў да высновы, што сёньняшні паляўнічыя так узброены, што ў зьвера не застаецца шанцаў на выратаваньне. І гэта робіць паляваньне нецікавым, ня кажучы ўжо пра негуманнасьць забойства братоў нашых меньшых, якія пакутуюць ад Чарнобыля гэтак жа, як і дзеці.

Сяргей Антончык заяўляе, што марыць аб паляваньні, але толькі з фотастрэльбай. У сапраўдным паляваньні падчас сваёго дэпутацтва ён удзелу не прымаў: "Гэтым займаліся намэнклатуршчыкі, якія мяне да сябе не запрашалі, а калі б нават запрасілі, то хутчэй дзеля таго, каб падстрэліць мяне замест таго дзіка". Што ж тычыцца валоданьня зброяй, то дэпутат 12-га скліканьня Антончык прызнаўся СВАБОДЗЕ, што ў дзяцінстве страляў з самапалу і нават прайшоў "курс маладога падрыўніка", пасьляхова разьбіраючы ўсялякія выбуховыя прыстасаваньні, якія ён знаходзіў у партызанскіх лясох на сваёй радзіме пад Плешчаніцамі. "Палітык, як і сапёр, памыляецца адзін раз, а я яшчэ жывы", – нагадвае ўсёй намэнклатуры Сяргей Антончык.

Валянцін Голубеў – вось хто хутчэй за ўсё ў хуткім часе стане сапраўдным паляўнічым. На каталіцкія Каляды ён упершыню пабываў на паляваньні разам з сябрамі, правёўшы незабыўныя двое сутак у палях, лясах ды буданах Айчыны. З захапленьнем Голубеў распавядае, як падчас адлігі праваліўся ён у канаву, як, быццам вядомы паэт, адмарозіў нагу, але ўсё ж вярнуўся дадому з зайцам-русаком у заплечніку. Вушастага "масьлака" ў той жа вечар засмажылі і зьелі – дэпутацкія семʼі цяпер радыя кожнаму забітаму зайцу. Дзеці і жонка Голубева нарэшце пачалі называць яго "здабытчыкам". Аднак карэспандэнту СВАБОДЫ "здабытчык" па сакрэце паведаміў, што заяц не ягоны трафэй, а падарунак сяброў. Ну, хоць на сяброў, калі не на выбаршчыкаў, сп.Голубеву пашанцавала.

Паляўнічыя гісторыі зьбіраў Алег ГРУЗЬДЗІЛОВІЧ

РЭПЛІКА

Хто мае вушы, той пачуе, хто мае розум, той зразумее

Па шчырасьці, мяне надзвычай зьдзівіла тое, што давялося прачытаць у артыкуле Сяргея Навумчыка "Пазбаўленьне ад ілюзіяў"(СВАБОДА, 22 сьнежня). Зьдзівіла, у першую чаргу, нязьменнасьць зьвычак асобных лідараў БНФ. У каторы раз я гавару ім – спадарства, нельга глядзець на сьвет заплюшчанымі вачыма! Сяргей Навумчык убачыў у маім артыкуле тое, што хацеў убачыць. Пакінуўшы ўбаку 9/10 маіх разважаньняў пра лёс БНФ, ён з нейкай шалёнай асалодаю накінуўся на дзьве-тры фразы. Да таго ж перакруціўшы іх да непазнавальнасьці.

Па-першае, я ніколі не адчуваў нянавісьці да БНФ і Зянона Пазьняка. Проста я ня ўтойваў таго, што падзяляючы, па вялікім рахунку, праграмныя палажэньні БНФ, я ніяк не мог пагадзіцца з палітычнымі мэтадамі і тактыкай лідараў Фронту. Бо яны ня ўлічвалі ні цяперашняга настрою людзей, ні нацыянальнай сьвядомасьці беларусаў увогуле. І ў гэтым сэнсе ня былі народнымі. Што, у рэшце рэшт, і прадэманстравалі прэзідэнцкія і парламанцкія выбары.

Па-другое, "непрыхаваны зьдзек", які Сяргей Навумчык мне прыпісвае, няхай аўтар лепей пакіне для сябе. Ніякага зьдзеку з БНФ у маім артыкуле блізка не было. Я пісаў: тое, што зрабіў БНФ на мяжы 90-х гадоў ужо стала часткаю людскай памяці і гістарычнай спадчыны. Беларускаму Народнаму Фронту, сапраўды, ёсьць чым ганарыцца. Але трэба аддаць належнае мінуламу і рухацца наперад, бо двойчы, як вядома, нельга ўвайсьці ў адну і тую ж ваду. Такая была выснова. Што тут зьдзеклівага?

Я таксама веру, і гэта – патрэцяе, што бел-чырвона-белы сьцяг вернецца. І пад гэтым сьцягам мы будзем штогод адзначаць найвялікшае дзяржаўнае сьвята – Дзень незалежнасьці Беларусі. Але гэта ўжо ня будзе маніфэстацыяй толькі апазіцыі БНФ, а стане дэманстрацыяй нацыянальнай еднасьці.

Прэтэнзіі асобных лідараў Народнага Фронту прыватызаваць ідэі сувэрэнітэту, нацыянальнага адраджэньня і рынкавых рэформаў, абвясьціць іх стратэгічным курсам і здабыткам аднаго БНФ – гэта праява непамернай палітычнай амбітнасьці і, між іншым, ідэалагічнай абмежаванасьці.

І тут, як мне здаецца, справа ў тым, што палітычныя крайнасьці, незалежна ад іх вызначэньня, сыходзяцца разам. У 70-80-я гады камуністычныя ідэёлагі бэсьцілі дысідэнтаў за тое, што Савецкая дзяржава, маўляў, іх згадавала, дала адукацыю і адчыніла шчасьлівыя далягляды, а яны, няўдзячная паскудзь, усё ў бок лесу (чытай у бок Захаду) глядзяць. Цяпер Сяргей Навумчык, выбітны ідэёлаг БНФ, дакарае ўсіх тых палітыкаў, якім БНФ і Зянон Пазьняк геройчнымі намаганьнямі адчынілі дарогу ў Страсбург і Парыж, а яны, зноў жа – няўдзячныя, хочуць "пакусаць" сваіх збаўцаў ад пакут над дысэртацыямі аб ролі Я.Сакалова ў беларускай сьвінагадоўлі. Вялікі дзякуй роднаму БНФ і асабіста Зянону Пазьняку!

Досыць. Адзінае, аб чым хачу папрасіць шаноўнага спадара Навумчыка: дазвольце мне думаць, разважаць і пісаць так, як я лічу патрэбным і прыстойным, не зважаючы ні на ваш статус ідэёлага і публіцыста БНФ, ні на прэзідэнцкіх канваіраў ад ідэялогіі.

Такое ж права я прызнаю і за вамі – пішыце, шаноўны, аналізуйце, даказвайце. А чытач разьбярэцца. Сьцеражыцеся толькі хлусьціць і бэсьціць дарма іншых – гэта ня лепшы спосаб нагадаць пра сябе. А наконт майго сумленьня не турбуйцеся – ёсьць каму.

І на разьвітаньне – каму ў БНФ так патрэбна і навошта сутыкаць ілбамі людзей, блізкіх па дэмакратычным духу і прынцыпах. Ці гэта таксама частка нязьменнай натуры Фронту – біць сваіх, каб чужыя баяліся? А можа, гэта патрэбна толькі Сяргею Навумчыку?

Анатоль МАЙСЕНЯ

БЕЛАРУСКІ ФОНД СОРАСА

мае гонар і шчасце павіншаваць з Новым годам і Калядамі:

нашых суграмадзянаў і ўсіх, хто сустракае гэтыя сьвяты на Беларусі;

ўсіх нашых сяброў - іх у адыходзячым годзе стала значна больш;

кожнага з 1281 пераможцаў усіх 47 конкурсаў, праведзеных у 1995 годзе;

ўсіх аўтараў астатніх 2876 праектаў - іх мы шчыра запрашаем удзельнічаць у новых конкурсах і перамагаць;

ўсіх, хто яшчэ ніколі не меў стасункаў з Беларускім Фондам Сораса, але мае жаданне з ім пазнаёміцца.

ДОБРАЯ НАВАГОДНЯЯ НАВІНА:

у наступным годзе дапамога Беларускага Фонду Сораса нашай краіне пераўзыйдзе сёлетнія *пяць мільёнаў амерыканскіх долараў.* Гэта значыць, што яшчэ больш павялічыцца карысць, якую прыносіць усім дабрачынная дзейнасць *Джорджа Сораса.*

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Уладзімер Бадроў: «Піва – гэта апазіцыя ў дзеяньні. Але апазіцыя толькі моцным напоям»

Да піўной тэмы ў перадсьвяточным нумары мы ў рэдакцыі СВАБОДЫ прыйшлі звычайным шляхам: сабраўшыся пасьля каталіцкіх Калядаў на планёрку, вымушаныя былі спачатку адправіць чалавека ў краму па піва.

"Бачыце, якое месца займае піва ў нашым жыцьці, – сказаў самы мудры з нас. – А вы усё лезеце з дыктафонамі да палітыкаў. Не, сёньняшні палітык павінен разумець, што найкарацейшы шлях да выбаршчыка ідзе праз ягоны страўнік і саступіць дарогу спэцыялістам у гэтай галіне". "Каму?" – спытаўся я, з надзеяй гледзячы на прыгожую наклейку "Вермуту", які вырабляе наш менскі "Крышталь". "Толькі піваварам," – прагучала ў адказ як канчатковы прысуд.

Але ці ж гэта пакараньне – сустрэцца напярэдадні сьвятаў з беларускім каралём піва Уладзімерам Бадровым, дырэктарам акцыянэрнага таварыства "Крыніца", дзе вырабляюцца лепшыя маркі беларускага піва? Вядома, што не. Гэта асалода – зьвярнуцца да тэмы, ад якой у нармальнага чалавека пачынае прыемна бурчаць у страўніку.

Піце піва пеннае...

– Спадар кароль піва! А вы самі калі ўпершыню асушылі куфаль піва?

– Позна, вельмі позна. Было мне ўжо за 20 гадоў, але я яшчэ не ўжываў ані граму алкаголю, бо вырас у сям'і, дзе да моцных напояў ставіліся стрымана, і да таго ж займаўся спортам – фэхтаваньнем. І вось аднойчы паехалі мы ў Львоў на спаборніцтвы, а сябры зацягнулі нас у горы на спартовую базу. Я ўпершыню быў у гарах. Упершыню загараў зімою на верандзе – голы! І, канечне, разагрэўся, разамлеў. Страшэнна захацелася піць, а ў буфэце не было нічога, акрамя піва. Вось я і цяпнуў піўка, і з таго часу піва – мой лёс.

– А вам не здаецца, што вы адсталі ад жыцьця, бо моладзь ужо выбірае Pepsi?

– Хто такое сказаў? Лухта гэта ўсё, рэкламныя штукі. У піва ў Беларусі выдатная будучыня, бо піва – напой бізнэсмэнаў, а Беларусь непазьбежна стане разьвітай эўрапейскай краінай.

– Адкуль вы гэта ўзялі? Ці гэта ўжо вашыя "рэкламныя штукі"?

– Тлумачу: мой уласны досьвед зносінаў з заходнімі бізнэсмэнамі паказвае, што яны не ўхваляюць, калі партнэр падчас перамоваў ужывае нешта моцнае – гарэлку, віскі альбо каньяк. Затое выбар піва дэманструе твой настрой на працу і адначасова на чалавечы кантакт. Таму ўжываньне піва бізнэсмэнамі ва ўсім сьвеце вітаецца. І ўвогуле заўважана: чым цывілізаваней краіна, тым больш у ёй п'юць піва і менш усялякіх напояў, якія зьбіваюць з ног. Піце піва – і вы ніколі ня згубіце здольнасьць да цьвярозых дзеяньняў.

АНЭКДОТ АД БАДРОВА

Адзін дзядзька, які праседзеў у піўным бары цэлы вечар, прыйшоў дамоў, калі жонка ўжо спала. Захацелася яму яшчэ піва. Ён дастаў пляшку, пачаў яе адкаркоўваць, але бутэлька высьлізнула з рук і разьбілася аб падлогу. Паколькі дзядзька зусім "ня быў п'яны", ён пачаў выціраць падлогу анучай, каўзануўся, паваліўся і параніў аб шкло месца, што крыху ніжэй сьпіны. Тады ён падышоў да люстэрка, заклеіў тое месца пластырам і лёг у ложак. Якім жа было ягонае зьдзіўленьне, калі першае, што запыталася жонка раніцай, было: "Ты што – ўчора, зноў напіўся?". "Адкуль ты даведалася?" – зьдзівіўся дзядзька. "Дык усё ж люстэрка залепленае пластырам!" – адказала разьюшаная жонка.

Губіць людзей ня піва...

– Спадар піўны магнат! Атрымліваецца, што былі вы некалі мушкецёрам, фэхтаваньнем займаліся, дзіркі ў людзях рабілі, і вось раптам зьявілася ў вашым жыцьці піва, і жыцьцё гэтае адразу зьмянілася. Вы сталі сур'ёзным-сур'ёзным. Няўжо сапраўды так?

– Ды не, канечне. Хіба можна быць цалкам сур'ёзным, займаючыся такой справаю, як выраб алкагольных напояў, тым больш – піва? Памятаю, як працаваў я калісьці на лікворa-гарэлачным заводзе. Кар'еру сваю з яго пачынаў. Час быў камуністычны, ніводны тыдзень бяз нейкага сходу не абыходзіўся. Вось неяк вярнуўся я з камандзіроўкі на роднае прадпрыемства, а там ідзе партыйны сход. Падкрэсьліваю, што на ліквора-гарэлачным заводзе нельга ня піць, ну хаця б крышачку. Там усе спажываюць, толькі калі знаходзішся ў калектыве, на гэта не зьвяртаеш увагі. А тут я прыехаў, так бы мовіць, чысьценькі. Сяджу на сходзе і "не даганяю". Рагатаць хочацца, а нельга. Прыйшлося адлучыцца на некалькі хвілінаў, зьбегаць у цэх, каб "дагнаць". І ўсё стала добра. Галасавалі за рэзалюцыю аднагалосна.

– А за што галасавалі?

– Ды ўжо ня памятаю, нешта там павышалі.

– І цяпер таксама павышаеце?

– Усяго хапае. "Павышаць" мы ня супраць, толькі народ наш ня вельмі адгукаецца. У яго свае праблемы. За апошнія гады ўжываньне піва зьнізілася ўдвая. Зараз штогод піва п'юць столькі, колькі і гарэлкі – кепская тэндэнцыя. Гэта пры тым, што якасьць нашага піва палепшылася, а асартымэнт не параўнаць з былым. І сьветлае піва выпускаем, і цёмнае, і хмяльное, і ня надта. Любому можам патрафіць.

– А жанчынам, якія любяць піва, але баяцца патаўсьцець, вы што прапануеце?

– Жанчынам я б параіў піць нашу "Крыніцу". Яна для іх як крыніца маладосьці. А ўвогуле мы ставім мэту, каб кожнаму жыхару Беларусі прапанаваць нешта па ягоным гусьце. Памятаю, у Нямеччыне бачыў я ў рэстарацыі каля аўтабану такую сцэну: спынілася машына, выйшлі з яе муж, жонка і хлапчук гадоў дзесяці і ўзялі ўсе па куфлю піва. Муж – вялікі цёмнага, жонка – сярэдні сьветлага, а сын – безалкагольнага піва. Выпілі, наталілі смагу і паехалі далей. І прыемна, і карысна. Хіба ж гэта блага?

АНЭКДОТ АД БАДРОВА

Жонка прачынаецца запаўнач ад таго, што дадому прыйшоў муж. Чуе, як той скіраваў на кухню і адчыніў лядоўню. "Ага, адзін раз адчыніў – узяў кілбасу. Згаладаў, на працы, відаць, затрымаўся," – думае жонка. "Не, другі раз адчыніў – узяў недапітую пляшку гарэлкі. Выпівалі на працы, падалося мала, магчыма, там і жанчыны былі," – зноў думае жонка. "Трэці раз адчыніў – бутэльку піва забраў, якую пакінуў на раніцу. Ну і напіліся. Без жанчыны не абышлося!" – жонка падымаецца з ложку. "Чацьвёрты раз адчыніў!!! Але ж у лядоўні больш нічога няма..." – жонка ўбягае на кухню і бачыць мужыка, які ў паліто стаіць каля адчыненай лядоўні і пытаецца: "Шэф, давязеш да цэнтру? Колькі? А пайшоў ты..."

«Бочка пива, водки таз и ...... приказ»

– Але дамовімся, што пра палітыку ані гуку...

– Добра, толькі адно пытаньне. Вось Шушкевіч у вас на "Крыніцы" з экскурсіяй калісьці пабываў. А як, калі запрасіць у госьці Аляксандра Рыгоравіча?

– Не, проста ён піва ня п'е. Усе ж пра гэта ведаюць, ва ўсякім разе ён так некалькі разоў па тэлевізіі казаў.

– А чаму ня п'е, як вы лічыце? Ці такое магчыма?

– Па-рознаму бывае. Камусьці не пашчасьціць, як мне ў свой час, апынуцца зімою ў Карпатах, пазагараць на вяршыні гары...

– Голым?

– ...

– Скажыце, вось цяпер даляр стаіць, а інфляцыя пакрыху ідзе. Для экспартэраў, кажуць, гэта вельмі кепска. Вы ж таксама шмат піва экспартуеце, напрыклад у Расію. Вось калі б прыехаў да вас прэзідэнт на экскурсію, няўжо б вы не спыталі яго, калі такая палітыка скончыцца?

– А я, наадварот, гэта падтрымліваю. Мы ж крэдыты ўжо не бярэм пад трыццаць працэнтаў у месяц, а пад тры-чатыры, вяртаць лягчэй. Не, нехта вельмі разумны сядзіць у дарадцах прэзідэнта.

– Вось з ім вы б выпілі піва, так? Дарэчы, а хто з нашых вядомых палітыкаў п'е піва?

– Лягчэй пералічыць, хто ня п'е. Усе п'юць. Наколькі ведаю, і прэм'ер-міністр, хаця мне з ім у адной кампаніі бываць не даводзілася. А як знакамітых аматараў піва ведаю Станіслава Шушкевіча ды ... Лаўрыновіча. Заўважце, што іхнай палітычнай дзейнасьці піва не перашкаджае.

АНЭКДОТ АД БАДРОВА

У адным чэскім мястэчку сябравалі пан упраўляючы і звычайны прыказчык. Дужа любілі пасядзець у шынку. Пан упраўляючы звычайна выпіваў за вечар дзесяць чарак бэхераўкі, а прыказчык – дзесяць куфляў піва. Потым яны ішлі па мястэчку і рабілі якую-небудзь шкоду, звычайна вартаўніка ў канаву скідвалі. Вядома, што на наступны дзень людзі пра іх казалі розныя байкі, але заўсёды адзначалі, што пан упраўляючы быў нападпітку, а прыказчык напіўся як сьвіньня. Сорамна бы[illegible]ыказчыку такое чуць, і пача[illegible]н прапускаць куфлі падчас застольля. Але нават калі выпіваў усяго пяць куфляў, усё роўна пра яго казалі; "напіўся як сьвіньня", а пра яго сябра – "быў нападпітку". Разззлаваўся прыказчык і аднойчы вечарам не адстаў ад пана ўпраўляючага, а выпіў нават болей за дзесяць куфляў. Тады яны так разгуляліся, што скінулі ў канаву не звычайнага вартаўніка, а жандара ў форме. Назаўтра быў суд. "Колькі выпіў пан упраўляючы?" – спыталіся судзьдзі ў сьведкаў. "Як звычайна, быў нападпітку," – адказалі сьведкі. "А колькі выпіў прыказчык?" – "Зноў напіўся як сьвіньня". Падумалі судзьдзі, падумалі і прысудзілі пану ўпраўляючаму год турмы, бо быў ён усяго нападпітку, але падняў руку на дзяржаўную асобу пры выкананьні службовых абавязкаў. Затое прыказчыка, які ня ведаў, што рабіў, бо напіўся як сьвіньня, адпусьцілі на волю.

– Ну-ну, показка ў вас з падтэкстам. А ўсё ж, што вы параіце палітыкам у будучым годзе? Піць піва ці больш моцныя напоі?

– Піва – гэта ў нейкім сэнсе апазіцыя ў дзеяньні. Апазіцыя, якая перамагае лепшай якасьцю. Вядома, апазіцыя – больш моцным напоям (мы ж дамовіліся – пра палітыку ні гуку). Піва і моцныя напоі павінны дапаўняць адзін аднаго, але ня зьмешвацца. У кожнага з іх свой "электарат", свой час, свае прысмакі. Вядома ж, што бывае, калі спажываць адначасова і тое і тое. Возьмем жыцьцё – там жа тое самае. Улада ёсьць улада, апазіцыя ёсьць апазіцыя. Сёньня ты пры ўладзе, спажываеш моцныя напоі, але не забывайся, што на наступны дзень захочацца піва. Такім чынам – няхай жыве піва!

– Якімі будуць вашыя навагоднія пажаданьні ўсяму беларускаму народу?

– Больш усьміхацца і радавацца жыцьцю нягледзячы на ўсе цяжкасьці. Няхай найсмачнейшы куфлік піва ў сваім жыцьці вы вып'еце не ў наступным годзе. А ўвогуле я б падараваў кожнаму суайчыньніку па бочцы піва, калі б меў такую магчымасьць.

– Гэта як у вядомым пажаданьні дэмбэлям: "...Бочку пива, водки таз и Устинова приказ"?

– Ну, прыкладна так, але ж крыху [illegible]

– Дзякуй вам. З Новым годам! З новым півам!

Гутарыў, папіваючы піва "Бурштын Беларусі", Алег ГРУЗЬДЗІЛОВІЧ

ВАЧЫМА СУСЕДЗЯЎ



Малюнак з газэты "Киевские ведомости"

АНЕКДОТ

Бухгалтер проверяет отчет о командировке:
– Это что за астрономическая цифра?
– Это я потратил на автобус.
– Я попрошу вас больше не покупать автобусов.

***

Знакомый спрашивает у бывшего своего сослуживца:
– Говорят, ты теперь бизнесмен. Каким же делом заворачиваешь?
– О, торгую предметами женского туалета.
– И успешно?
– Вполне. У жены еще остались кое-какие вещички, а теща сидит дома почти голая.

***

Дудаев и Лукашенко встретились в желудке у Ельцина.
– Что, Александр Григорьевич, Борис Николаевич и вас проглотил?
– Ошибаетесь. Мы вошли другим путем.

Вы любіце СВАБОДУ, маеце вольны час і хочаце крыху зарабіць?

Наша газэта можа заключыць з вамі дамову на распаўсюджваньне СВАБОДЫ

ТЭЛЕФАНУЙЦЕ:
- Менск 36.24.41
- Берасьце 26.47.13
- Гарадня 45.41.83
- Магілёў 22.63.19
- Орша 4.28.57

Рэдакцыя газэты "Народная воля" паведамляе сваім чытачам, што наступны нумар "НВ" выйдзе 11 студзеня 1996 г.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Віталь ЦЫГАНКОЎ

Магло быць і горш...

Калі б мяне папрасілі нейкай адной унівэрсальнай фразай сімвалічна вызначыць галоўны матыў мінулага года, я акрэсьліў бы яго так: то быў год пазбаўленьня ад рамантычных ілюзіяў

1995 дапамог нам зразумець, што цудаў не бывае і гісторыя ня крочыць фантастычнымі скачкамі. Напэўна, некаторым людзям усё яшчэ хочацца верыць, што ў адзін чароўны дзень у нашай краіне ўсё кардынальна пераменіцца, на шырокія народныя масы сыйдзе прасьвятленьне і яны шчыльнымі радамі пакрочаць да дэмакратыі і культуры. Але мінулы год нанёс моцны ўдар па такіх наіўных марах. Нянавісьць да таталітарнай улады зусім не азначае любові да дэмакратыі. Незадавальненьне сваім матар'яльным становішчам яшчэ не гарантуе імкненьня зрабіць што-небудзь дзеля яго паляпшэньня. Посьпехі суседа часьцей выклікаюць жаданьне не працаваць і зарабляць, а забраць ды падзяліць.

У 1995 хуткімі тэмпамі працягвалася разьдзяленьне нашага грамадзтва, аддаленьне розных сацыяльных групаў. Багатыя ўсё больш аддаляліся ад бедных, улада – ад выбаршчыкаў, інтэлігенцыя – ад народа, культура – ад шырокіх масаў. Беларусь усё больш становіцца краінай кантрастаў, дзе цэны ў рэстарацыях большыя за нямецкія, а заробак ніжэй за нігерыйскі. Здабыткі нашых навукоўцаў, мастакоў, артыстаў, пісьменьнікаў маюць сусьветны ўзровень, але значная частка народа не валодае элемэнтарнымі рэчамі бытавой і палітычнай культуры.

Для мяне асабіста самай страшнай адмоўнай падзеяй года па-ранейшаму застаецца "выдаленьне" галадуючых дэпутатаў з будынку Вярхоўнага Савету. У гэтым выпадку няважна, якой палітычнай арыентацыяй кіруюцца ахвяры бандытызму, важна іншае: гэтым актам і ўсёй сваёй дзейнасьцю на працягу года Лукашэнка пераконваў жыхароў Беларусі, што закон і мараль у нашай краіне – нішто, а грубая сіла – усё. Ад прэзідэнцкай кампаніі, ад "стрэлаў" у Лёзьне Лукашэнка мэтадычна зьнішчаў тую маральна-этычную мяжу дазволенага, якая павінна існаваць у кожным грамадзтве. Але самае непрыемнае адкрыцьцё, якое "падарыў" многім мінулы год, – усьведамленьне таго, што мільёны беларусаў ня маюць нічога супраць такой палітыкі. Нават наадварот, мільёны людзей разам са сваім прэзідэнтам з задавальненьнем падзялілі перамогу над "нацыяналістамі" і "гэтай мовай".

У 1995, бадай, упершыню для многіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі так горка і драматычна "раскрылася" відавочная для ўсяго астатняга сьвету сумная ісьціна: чалавек – істота не ідэальная, яна мае вечную і таямнічую схільнасьць да зла і нянавісьці. Але нашы людзі, у адрозьненьне ад Захаду, акрамя агульначалавечых заганаў і хібаў, маюць яшчэ ўласныя, непаўторныя, "савецкія". Бадай, упершыню на Беларусі яны выліліся так адкрыта і настойліва. "Народны прэзідэнт" вельмі трапна і адпаведна акумуляваў у сваёй асобе азлабленьне, прагу помсты ўсім "сыценькім і багаценькім", што квітнеюць сярод пэўнай часткі насельніцтва. У мінулым годзе беларусы ня сталі дабрэйшымі. Магчыма, у 1995 некаторыя ўпершыню зразумелі, што такія палітыкі, як Лукашэнка, Жырыноўскі, Зюганаў, бліжэйшыя гады заўсёды будуць мець сваіх выбаршчыкаў, свой значны электарат. І калі прэзідэнт Беларусі гаворыць, што ён прыйшоў надоўга, яму варта верыць: ня гэты, дык іншыя лукашэнкі будуць валодаць сэрцамі і галасамі люмпэнаў і маргіналаў.

Але пазбаўленьне ад ілюзіяў пачалося і сярод такіх людзей. Усе ворагі пераможна разьбітыя – чаму ж жыцьцё пагаршаецца? Рэйтынг прэзідэнта зноў пачаў падаць – і "ўзбадзёрыць" яго можна толькі чарговай масавай акцыяй накшталт рэфэрэндуму. У адзін невясёлы дзень абураныя масы прыйдуць да прэзідэнцкага палацу і скажуць: дзе наш хлеб з маслам? "Цудаў не бывае", – сказаў ім 1995 год. "І ня будзе" – дадасьць кожны, хто ведае гісторыю і разьбіраецца ў эканоміцы.

Самае забаўнае, што ў новы Вярхоўны Савет прыйшло дастаткова маладых папулістаў (міні-лукашэнкаў у больш цывілізаваным выглядзе), і прэзідэнту ўжо давядзецца змагацца са сваімі ўласнымі палітычнымі ценямі. Калі ў савецкім кіно панавала барацьба добрага з лепшым, нас чакае бітва кепскага з яшчэ горшым.

Але 1995 даў і парасткі надзеі. У Вярхоўны Савет прайшлі людзі, якія ня сталі "практыкамі" і "прагматыкамі" і даказалі, што палітыку можна рабіць чыстымі рукамі. Іх нямнога, але яны мусяць увасабляць маральную альтэрнатыву пануючым у сучаснай беларускай палітыцы норавам. Ды і сам факт абраньня парламанту па сутнасьці стаў адзінай перашкодай на шляху Лукашэнкі; упершыню ўнутры "сваёй" краіны ("мая мяжа, мая дзяржава, мой бюджэт") ён не дабіўся таго, чаго прагнуў.

Верны свайму прынцыпу "спачатку дбай пра свой рэйтынг, а потым – пра эканоміку", прэзідэнт, каб усім было прыемна, вынайшаў тэрмін "рынкавы сацыялізм" і пачаў яго ажыцьцяўляць. У выніку – нават адна з мацнейшых беларускіх фірмаў "Пушэ" вымушаная была аб'явіць пра вывад сваёй фінансавай актыўнасьці за тэрыторыю Беларусі. Астатнія, не такія магутныя, зрабілі гэта моўчкі. Бюджэт недалічыўся мільёнаў даляраў, якіх так не хапае бедным слаям насельніцтва, якія так спадзяваліся на свайго прэзідэнта...

Тым часам шырокія народныя пэнсіянэрскія масы самым непасрэдным чынам далучыліся да "рынкавага сацыялізму", займаючыся продажам на вуліцах замежных цыгарэтаў. Падаткі зараз плаціць толькі самы апошні недарэка. Увогуле, усё большая частка насельніцтва занятая пераважна тым, што ва ўсіх відах і формах падманвае і абдурвае дзяржаву. Магчыма, нават самы галоўны ў нашай краіне "стваральнік ілюзіяў" разьвітаўся з адной ілюзіяй: аказалася, моцную ўладу таксама не паважаюць і не баяцца. Паважаць будуць уладу разумную і ўзаемакарысную. У 1995 улада толькі аддалілася ад такіх крытэрыяў.

Дзяржаўныя структуры за апошні год фактычна сталі ворагамі эканомікі і культуры – аказалася, што асноўную сваю ролю яны цяпер бачаць у тым, каб адабраць, забараніць, пакараць. Таму іхныя былыя функцыі ўзялі на сябе іншыя: творчыя конкурсы ладзяць усялякія фонды, кватэры будуюць прадпрымальнікі, новыя шпіталі ўзводзяць немцы ды італійцы, дзяцей вучаць прыватнікі.

У 1995 адбылося багата падзеяў, якія любому рэалістычна думаючаму чалавеку маглі пераканаўча прадэманстраваць, дзе мы знаходзімся – і геаграфічна, і гістарычна. Бадай, найбольш жорстка вызначыў нашае сапраўднае месца былы прадстаўнік МВФ у Беларусі Ўільям Мідлкоп ў сваім разьвітальным інтэрвію, дзе ён, напэўна, упершыню вырашыў выказвацца шчыра. Пасьля трох гадоў працы у Беларусі Мідлкоп прыйшоў да высновы, што наша вёска знаходзіцца недзе на адным узроўні з вёскай галандскай... канца мінулага стагодзьдзя.

Мы сталі менш наіўнымі – і гэта, можа, самы асноўны вынік года. Мы ўсё менш марым пра тое, як ашчасьлівіць увесь сьвет ці, як мінімум, – Беларусь; і ўсё больш дбаем пра сябе і сваіх блізкіх. Засталося толькі навучыцца знаходзіць у плыні інфармацыйнай "чарнухі" радасныя зерні: футбалісты абыгралі галандцаў, купалаўскі тэатр выдаў некалькі шыкоўных прэм'ераў, нашы школьнікі перамагаюць на сусьветных алімпіядах, наш юны шахматыст становіцца чэмпіёнам Эўропы. І галоўнае – не забывацца паўтараць "пра сябе" адну сакрамэнтальную фразу: магло быць і горш...

Сяргей АСТРАЎЦОЎ



Пад бой крамлёўскіх курантаў

Некалькі штрыхоў да генэалогіі савецкага беларуса

Першае студзеня – гэта сьвята, якое ў нас ніхто ніколі не адзначаў. Хіба што падымалі келіхі з нагоды першага дня Новага года. Пра тое, што гэта – дзень утварэньня БССР, ня толькі ня згадвалі, а нават звычайна ня ведалі. Першага студзеня таксама ўзьнікла кубінская рэспубліка. На Кубе гэта – нацыянальнае сьвята. Фідэль Кастра дагэтуль самотна бароніць у Лацінскай Амэрыцы першы і апошні бастыён сацыялізму. У цэнтры Эўропы таксама ёсьць адзін няўрымсьлівы прэзідэнт, які ўпарта працягвае ратаваць сацыялізм, ад якога ўсе суседнія краіны даўно адмовіліся. Цікавае супадзеньне.

Парыж для савецкіх людзей заўсёды быў правінцыяй, бо туды амаль ніхто ня езьдзіў. Затое ў нас была Масква, таму жылося спакойна. Быў Крэмль з генсэкам, які за ўсіх нас думаў і прымаў рашэньні і які ў навагоднюю ноч па-бацькоўску накіроўваў нас. Былі крамлёўскія куранты, па якіх мы выпівалі шампанскае, сустракаючы Новы год. Нарэшце, перад Крамлём пільна ахоўваўся маўзалей з нашым правадыром і настаўнікам. Праўда, не да маўзалея было беларусам, якія мусілі езьдзіць у Маскву. У савецкія часы некаторыя мае знаёмыя рэгулярна наведваліся ў "столицу нашей Родины", каб прыдбаць зімовыя жаночыя боты або яшчэ які-небудзь дэфіцыт. Але бадай ніколі ў гэтых хадакоў не ўзьнікала думка пра наведваньне маўзалею. Не сказаць, што яны грэбавалі трупам правадыра. Не. Для духоўнай раўнавагі цалкам хапала ўсьведамленьня таго, што ён па-ранейшаму там ляжыць.

Пасьля зьнікненьня СССР у душах беларусаў была парушана звыклая сістэма каардынатаў. Беларусы страцілі звыклы грунт пад нагамі. Бо раней усё пачыналася з Крамля, які цяпер апынуўся за мяжой, у суседняй дзяржаве. Нават сонца ўзыходзіла адтуль, калі меркаваць па песеньцы "Утро красит светлым светом стены древнего Кремля". Дзеля гэтага беларусаў прымушалі ўставаць на досьвітку, на гадзіну раней, каб усё было абавязкова паводле маскоўскага часу і каб больш працавалі. А калі стрэлкі гадзіньніку перавялі на мясцовы час, гэта значыла, што пара нарэшце пачынаць жыць уласным розумам. А да гэтага яшчэ трэба было прызвычаіцца, пераадолець унутраны бар'ер. Час – свой, грошы – свае, нават герб і сьцяг сталі ўжо не савецкія. Тры сланы, на якіх трымаўся сьвет, – партыя, Ленін, СССР – сканалі ад старасьці. Засталіся толькі старыя сьветапогляд і ідэялогія. А гэта, на жаль, асноўнае. У сьвеце адбыліся глабальныя перамены. Пасьля бэрлінскага быў разбураны і крамлёўскі мур. Былыя ідэялогія і арыентацыя Менску на Крэмль вымагалі зьменаў. Нацыянальнага дзяржаўніцкага курсу нашая намэнклатура традыцыйна баялася як агню. Таму лагічнай стала пераарыентацыя на нэйтралітэт. Але нэйтральнасьць дзяржавы вымагае адначасова сувэрэннай палітыкі. Вось чаму ад пачатку яна праводзілася непасьлядоўна. Адсюль паходзяць і палітычныя хістаньні,галоўная мэта якіх – далучыцца зноў да Масквы. Бо жыць сваім розумам, з уласнай працы – цяжка.

Савецкія беларусы ня ведалі, як паводзіць сябе ў новай сітуацыі. Яны нагадвалі вучняў, якім далі рашаць задачу, з умовамі якой яны сутыкнуліся ўпершыню. Параіліся і выбралі са свайго асяродзьдзя, як здавалася, самага разумнага. Прэзідэнта. Аднак яму таксама, апроч таго, што ў Маскве ўсё ёсьць, іншыя рэцэпты невядомыя. Як дзе што – ён адразу ляціць да крамлёўскіх кіраўнікоў. Вельмі ганарыцца, што яны яго сустракаюць як роўнага. Але яму так толькі здаецца. Звонку ён нагадвае васала, які зьяўляецца на дварцовых прыёмах калі і не з каменем пад пахай, дык з патаемнай мэтай, пра якую ўсе даўно ўжо ведаюць.

Мары Лукашэнкі пра маскоўскі пасад былі б больш рэальнымі, як мне здаецца, пры наступным варыянце: каб пачаткова ён быў дастаткова вядомым савецкім палітыкам, захаваў у Маскве свае пазіцыі, а потым, як Шэварднадзэ, вярнуўся у сваю рэспубліку, якая паспрабавала адарвацца, і вярнуў яе назад у "маскоўскае" ўлоньне. Але трэба, каб рэспубліка тая была памерам з Украіну. Вось Кучме маглі б дазволіць такое – за Крым, за Чарнаморскі флот ды ўсё астатняе. А нашаму "бацьку" – наўрад ці. Бо яму хочацца, маючы кавалачак былога савецкага пірага, валодаць усім. Гэта ўсё адно, як купіўшы пару акцый, прэтэндаваць на кантрольны пакет.

Кожны, аднак, падсьвядома разумее сваё становішча. Павінен разумець і "бацька". Таму ён і прагне вылузацца з яго, скокнуць вышэй галавы. Вось чаму і ў адной са сваіх нядаўніх прамоваў ён ганіў улады Эстоніі, зрэшты, не называючы яе. Здавалася б, відавочна, што з кіраўнікамі маленькай краіны, якая ня мае амаль ніякіх рэсурсаў, Масква размаўляе фанабэрліва, з пазіцыі сілы імкнецца дыктаваць свае ўмовы. Але Эстонія не паддаецца, і хочацца расейцам ці не, але ім даводзіцца лічыцца з пазіцыяй эстонцаў, і ў выніку размова на самой справе адбываецца на роўных. Карацей, прыклады Эстоніі і Беларусі супрацьлеглыя, чым і выкліканае раздражненьне, а, магчыма, і зайздрасьць "бацькі".

Прычым у падобных выпадках выкарыстоўваецца жупел дружбы народаў, якая, нібыта, парушаецца ў Эстоніі або яшчэ дзе-небудзь. Расейцаў у Эстоніі, між іншым, працэнтна непараўнаўча больш, як у Беларусі, таму тое, што ў нас іх, напрыклад, не прымушаюць вывучаць нацыянальную мову, ня надта ўражвае. Вельмі ўражвае Крэмль. Але лічбы можна падправіць дзеля большай пераканаўчасьці. Адзін мой знаёмы ўнівэрсітэцкі выкладчык, які з увагаю слухае ўсе "бацькавы" прамовы, зніякавеў, калі пачуў з ягоных вуснаў, што на Беларусі нібыта жыве два з паловаю мільёны расейцаў. Вядома, аднак, што іх на мільён менш, а з дзесяці мільёнаў нашага насельніцтва восемдзесят працэнтаў складаюць самі беларусы. Так што сапраўды часам нават у арыфмэтычных задачах палітыкамі робяцца памылкі, на жаль, сьвядома.

Гэтая самая дружба народаў у нас закладзеная, здавалася б, на генэтычным узроўні. Пра яе так шмат гаварылася, што цяпер са зьдзіўленьнем пачынаеш усьведамляць, што мы, беларусы, нават сваіх суседзяў недалюбліваем. Узяць літоўцаў, палякаў або ўкраінцаў. Ніхто з іх нам асабліва не падабаецца. Магчыма, што мы закадаваныя на аднабаковую дружбу. Нездарма ж у гімне БССР "Мы, беларусы, з братняю Русьсю..." пра іншых нашых суседзяў не гаворыцца ані слова. Але ж самае дзіўнае, калі задумацца, што расейцаў мы таксама любім не нашмат больш за іншых.

Масква засталася цэнтрам прыцягненьня, неафіцыйнай сталіцай. Мы па-ранейшаму глядзім пераважна маскоўскае тэлебачаньне, чытаем маскоўскія газэты. Усё ў рэшце рэшт дагэтуль вырашаецца ў Маскве і залежыць ад яе. Калісьці ў нас былі іншыя сталіцы – Вільня, Варшава, Пецярбург, куды вялі ўсе дарогі, але гэта даўно забытае. Свой жа шанец стаць рэальнай сталіцай СНД Менскам выкарыстаны ня быў. Напэўна, выйсьце ў тым, каб цэнтрам сусьвету для саміх беларусаў стаў менавіта Менск.

Сёньня беларусы адчуваюць ціхую настальгію па сацыялізму, па нейкіх ільготах, гарантыях, падачках, забываючыся, што правоў яны мелі шмат, але пераважна толькі на паперы. Парадокс, але Лукашэнка, абяцаючы зноў пабудаваць сацыялізм, большасьць сацыяльных ільготаў, аднак, ад людзей забірае, тым самым сам сабе супярэчачы. Спрабуе стрымаць інфляцыю, бо гэтага ад яго патрабуюць міжнародныя валютныя арганізацыі.

У нечым падобная сітуацыя ў Францыі, але там усё наадварот. Французаў таксама прымушаюць зьменшыць інфляцыю з пяць да трох працэнтаў у год. Таму Жак Шырак і вырашыў крыху зьменшыць сацыяльныя ільготы французаў, гэта значыць, тое, што зрабіў і Лукашэнка. Аднак беларусы прывыклі абурацца на кухні, а французы паўсталі супраць. Сацыялісты ў Францыі імкнуліся захаваць больш дзяржаўны сэктар у эканоміцы, датавалі стратныя прадпрыемствы. Таму пасьля свайго абраньня Шырак, пабразгаўшы ядзернай зброяй, пачаў наступ на "сацыялістычныя заваёвы працоўных", бо дзяржаўныя выдаткі перавышалі дзяржаўныя даходы. Штосьці падобнае адбываецца і ў нас, але бяда Беларусі ў тым, што ўсё тут як бы несапраўднае, палавіністае: перабудова, сувэрэнітэт, прыватызацыя, і нават ад прэзідэнта пакуль толку мала. Хіба што льготы забраў і вярнуў савецкі герб.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

СВАБОДА
29 сьнежня 1995 г., №62

Сяргей ДУБАВЕЦ

Камунізм без камуністаў

Ты кажаш, што ва ўсіх краінах у нашым канцы Эўропы на выбарах перамагаюць камуністы. Яно нібыта і так. Але я думаю: якое дачыненьне ўсе гэтыя пераможцы маюць да камунізму, да нашай спрадвечнай мары пра лепшую будучыню?

Эпоха рыцараў закончылася Дон Кіхотам, а самое слова "рыцар" стала архаізмам і ўжываецца ў пераносным сэнсе. Эпоха камуністаў завяршылася жалезным дрывасекам – героем фільма, які так і называўся "Камуніст", а самое слова "камуніст" прысвоілі сабе кіслатварыя сталаначальнікі накшталт усіх гэтых сьлюньковых, сакаловых, малафеевых – змагары, чыё змаганьне скончалася не разам з апошнім удыхам, а разам са стратай пасады. Тыя, хто прыйшоў ім на зьмену, увогуле ня маюць нічога агульнага з нашымі сьветлымі марамі, ня маючы на тое ані жаданьня, ані таленту, ані фантазіі. Яны толькі прыкрываюцца словам "камуніст", ведучы да поўнае дэградацыі гэтага некалі высакароднага паняцьця.

У Беларусі першыя камуністы зьявіліся яшчэ ў сярэднявеччы. У Пінску існаваў кляштар манахаў-камуністаў. І толькі на першы погляд паміж імі і савецкімі камуністамі не было ніякае сувязі. Калі разабрацца, то паміж царквою і КПСС існавала вельмі выразнае падабенства. Фактычна партыя, якая адлучыла царкву ад дзяржавы, сама прыпадобілася да царквы. Усе гэтыя рытуалы... Напрыклад, зьезды КПСС, на якіх заносілі і выносілі сьцягі, – чым не крыжовы ход? А дэманстрацыі? А сістэма ідэалагічнага "опіюму" для народа? А фіксаванае членства, пры якім і ў царкве і ў партыі было шмат сапраўдных і фальшывых вернікаў і камуністаў?.. Праўда, мяне ва ўсім гэтым цікавіць ня столькі фармальны, колькі сутнасны бок.

Прафэсія у мяне такая – журналістыка. У савецкія гады нас называлі байцамі ідэалагічнага фронту. Таму за час свае працы я разоў пяць мог і мусіў уступіць у кампартыю. Але не ўступіў. Прыдумляў для начальства дурацкія апраўданьні пра тое, што не дасьпеў, не гатовы і г.д. Хоць і сам сабе толкам бы не патлумачыў, што мяне стрымвала ад той партыі. Магчыма, баяўся страціць звычайную чалавечую прыстойнасьць. Як табе сказаць... Ну, адчуваў я ў сабе гэты ўнутраны дар – першым ісьці ў бой і баяўся гэты дар афармляць як права. Дар быць прыстойным чалавекам гэта ўсё ж рэч на парадак больш каштоўная за нейкае там права. Тое самае, дарэчы, і з царквою. Трэба пачуваць сябе ўнутрана слабым ці лянівым чалавекам, каб свае адносіны з Богам абавязкова афармляць праз царкву. Я заўсёды баяўся свае сапраўдныя адносіны падмяніць штучнымі, фармалізаванымі.

Там, дзе я працаваў, акрамя мяне некамуністаў не было. І я адчуваў сваю фантастычную перавагу над усімі гэтымі партыйцамі, бо быў, калі хочаш, на парадак большым за іх камуністам. Я чытаў Маркса з Леніным і партыйныя дакументы, але не як нейкія абсалютныя кананічныя тэксты, а як асабістае, як вытлумачэньне сьвету. Я спрачаўся з імі, бо мой сьвет быў на стагодзьдзе пазьнейшы, а яны заставаліся там, у "Новай Рэйнскай Газэце", на лонданскім зьезьдзе, у перадўстройствах рабкрынаў і г.д. Пасьля Леніна, чамусьці, не было нікога, хто б на адпаведным узроўні развіваў першых тэарэтыкаў. Але ж жыцьцё не скончылася... Пісалі, вядома, шмат. Але хто цяпер возьме ў рукі збор твораў Сталіна ці васьмітомнік Брэжнева?

Ты сьмяешся, калі я кажу, што я больш камуніст за членаў партыі, але гэта так. Пры савецкай сістэме я ніколі ні ад чаго не адлынваў, быў, як кажуць, "на перадавых рубяжах". І канец сістэмы ў гэтым сэнсе не азначаў для мяне абсалютна нічога. Іншыя ўступалі ў партыю, выходзілі з партыі, уступалі зноў, зноў выходзілі, мянялі назвы і праграмы, а мая Партыя Прыстойнасьці існуе і будзе існаваць столькі, колькі будзе існаваць чалавечае грамадзтва і наша агульная мара пра лепшае жыцьцё, наш *камунізм*, прыдуманы за тысячы гадоў да Маркса з Леніным. Вось першае, што ты павінен зразумець. Ты кажаш, што ты, камуніст, адрозьніваешся ад мяне тым, што верыш у сьветлую справядлівую будучыню. Але я, беспартыйны, веру ў гэтую будучыню больш за цябе. **Камуністы адрозьніваюцца ад іншых тым, што імкнуцца манапалізаваць агульную мару пра сьветлую будучыню.**

І таму для мяне пытаньне – хто такія ўсе гэтыя людзі, якія называюцца камуністамі сёньня? Шчыра кажучы, для мяне сьветлая будучыня ніяк ня вяжацца з усімі гэтымі новікавымі ды зюганавымі. Шэрыя, руцінныя дэмагогі, якія прысабечылі права на чалавечую прыстойнасьць, на тое, каб першымі ісьці ў бой. Яны прысвоілі права, бо не надзеленыя такім дарам. Але ісьці ў бой і называцца генэраламі – дзьве розныя рэчы.

Што такое камунізм? У народзе раней казалі проста – гэта калі грошай ня будзе. Партыйцы казалі: гэта калі ад кожнага па здольнасьцях, кожнаму па патрэбах. Лозунг, як бачыш, просты і ясны. Бо колькі існуе чалавецтва, столькі яно б'ецца над прымірэньнем сваіх здольнасьцяў з патрэбамі. Гэта канфлікт, які тысячагодзьдзі дае энэргію ўсёй культуры, эканоміцы, палітыцы. Напэўна, без яго немагчымае было б самое жыцьцё. Гэта такое ж вечнае пытаньне, як чалавечы розум, як каханьне, як дасканалы сьвет. А вечнае пытаньне таму, што стаіць аднолькава для ўсіх, а вырашае кожны па-рознаму. Бо як няма двух аднолькавых людзей, двух зусім аднолькавых сітуацый, так няма і тыпавога вырашэньня. Зрабіць усіх на адзін капыл спрабавалі ня раз, але нават калі і ўдавалася праз гэта людзей ашчасьлівіць, то сёньня іхняе шчасьце выклікае ў нас у лепшым выпадку жаласьць. І вось табе другая вельмі важная выснова: камуністы адрозьніваюцца ад астатніх людзей тым, што імкнуцца "ўвесьці" нашу агульную мару праз падгонку ўсяго жыцьця на адзін капыл, праз уніфікацыю. Гэткае штучнае ўвядзеньне дасканалага сьвету. Між тым адзіная абсалютная дасканаласьць, якую дагэтуль ведае чалавецтва – гэта сьмерць. Завершаны цыкл. Вось чаму 70 гадоў камуністы ўводзяць шчасьце, а атрымліваецца суцэльная руціна і мор.

Калі хочаш, дам табе больш выразную фармулёўку: **камуністы ня маюць ніякага дачыненьня да камунізму.** І адзінае, што іх адрозьнівае ад іншых партый – імкненьне да татальнай уніфікацыі. Апошняе звычайна падабаецца найбольш цёмным і бедным слаям насельніцтва (маўляў, падзелім пароўну і ўсім нам будзе добра). Гэтыя "слаі" – электарат камуністаў, і камуністы робяць і будуць рабіць усё, каб гэты электарат захоўваць, г.зн. трымаць людзей у цемнаце і беднасьці.

Але і гэта не самае галоўнае, чаму за іх галасуе так шмат людзей. Галоўнае, што яны ўвасабляюць сабою звыклы тып начальства, якога ў нас усё яшчэ баяцца і таму "паважаюць". Вось і ўсё. І абсалютна недарэчы тут гаварыць пра лепшае жыцьцё, пра камунізм. Што да класавае барацьбы, дыктатуры пралетарыяту, сусьветнай рэвалюцыі і г.д., то пра такія рэчы сёньня можа казаць толькі чалавек надта ўжо прынцыповы і паслядоўны. Сучасныя беларускія камуністы не нясуць у сабе ўсіхную мару пра лепшы сьвет, а толькі практыкуюцца ў бытавым папулізме накшталт выроўніваньня ўсіх і ўся – паводле матэрыяльнага і інтэлектуальнага набытку. Пазбаўленая імі ж самімі (ці іхнімі папярэднікамі) гэтага набытку маса ім верыць.

Між тым на Захадзе, дзе маса людзей мае ўласнасьць, адбываюцца дзіўныя рэчы. Там, у капіталістаў, будуецца грамадзтва, якое ўсё больш нагадвае нашу мару пра сьветлую будучыню. Мы марым і сядзім у яме, а яны памаленьку будуюць. Там, дзе ўніфікатараў-камуністаў сьпіхнулі на ўзбочыну грамадзкага жыцьця, там і паўстае тое, што можна назваць шляхам да камунізму. І вось табе чарговая выснова: **камунізм будуюць на Захадзе, а ня ў нас.** Хочаш доказаў? Ды ты іх і сам ведаеш...

Вядома, нам так доўга ўбівалі ў галаву, што камуністы – адзіныя будаўнікі сьветлае будучыні... Але, аказваецца, усе гэтыя лібэралы і кансэрватары таксама хочуць зрабіць жыцьцё ўсіх людзей лепшым. Іншая рэч, што яны працуюць з *дадзеным* жыцьцём, а не імкнуцца ўсё разбурыць "до основанья, а затем..." Яны ўглядаюцца ў жыцьцё, вылучаюць у ім станоўчыя і адмоўныя тэндэнцыі і ўзмацняюць сваімі сродкамі першыя ды затушоўваюць другія. Яны пазьбягаюць уніфікацыі, разумеючы, што часам самы нязначны фактар можа зьмяніць цэлыя глабальныя сітуацыі. І вось выснова: і лібэралы, і кансэрватары таксама будуюць камунізм. Прычым, як бачыш, у адрозьненьне ад камуністаў, – пасьпяхова.

У краінах, дзе не карысталіся марксавымі мэтадамі, дасягаюць *ягоных* мэтаў эвалюцыйным шляхам. Згадай славуты шведзкі сацыялізм (разгалінаваную сістэму сацыяльнае дапамогі) або Англію, дзе 40% бюджэтных сродкаў разьмяркоўваецца не праз міністэрствы і ведамствы, а праз грамадзкія арганізацыі. Чым ня ўлада народу? Між іншым, толькі ў Польшчы такіх арганізацый сёньня больш за 20 тысяч. Ствараецца, напрыклад, фонд дапамогі якой-небудзь школе ў аддаленай правінцыі, зьбіраюць грошы, выдаюць на іх зборнік красвордаў (а палякі вельмі любяць красворды) і прадаюць гэты зборнік на цэнтральнай вуліцы ў Варшаве. "Купіце на дапамогу школе!" Такім чынам зарабляюць грошы, і школа працуе, і дзеці не адчуваюць сябе горшымі за іншых. Альбо ствараецца таварыства апекі зьняволеных, для якіх рэальная чалавечая патрэба – перавыхаваньне канкрэтнага зэка. Не дзяржава пра гэта ўсё думае, а "камуна". Ці, калі хочаш, згадай амэрыканскія макдональдсы, фабрыкі-кухні, пра якія так марыў Маркс і якія называў парасткамі камунізму. Ты можаш іх не любіць, але яны ўжо сёньня – ідэал, якога так і не дасягнулі савецкія прадпрыемствы грамадзкага харчаваньня. Страхавая мэдыцына, добрыя заробкі і пэнсіі, адсутнасьць жыльлёвай і харчовай праблемаў, ніякіх дэфіцытаў, рост вытворчасьці, экалагічны рух, росквіт культурнага жыцьця – усё гэта мае яшчэ ў сабе "атавістычныя элементы капіталізму", але ўсё гэта ёсьць, і наводзіць на думку, што развітыя краіны сьвету няўхільным эвалюцыйным шляхам ідуць да таго *камунізму*, ад якога мы цяпер адмаўляемся.

Ты ведаеш, што я не фанат Захаду і адзінае азначэньне, на якое згаджаюся – беларускі нацыяналіст. Але гэта і значыць, у маім разуменьні, – чалавек, які бесстаронна глядзіць на рэчы. Чаму нашы людзі імкнуцца на лячэньне ці апэрацыю менавіта на Захад? Нават тыя, каго там пасадзілі, просяцца сядзець там, а ня дома. Чаму на Захадзе забароненая рэклама цыгарэт і алкаголю, чаго ў нас поўна паўсюль? Колькі нашага народу рвецца эміграваць у Штаты, але ніхто не эмігруе адтуль з-за кепскага жыцьця. Дык дзе ж будуюць камунізм? Адказ такі – там дзе камуністычныя партыі памерамі нагадваюць клубы кактусаводаў.

...А камуніст Новікаў тым часам зноў загаварыў пра класавую барацьбу. Бо ў нас, маўляў, зноў зьявіліся класы бедных і багатых. Значыць, зноў трэба ўсіх рабіць беднымі. Калі ж нам усім урэшце перастануць замінаць быць нармальнымі?

Але давай падводзіць вынікі. Хто такія сучасныя камуністы? Гэта людзі, якія сёньня рэальна далей ад камунізму за кансэрватараў і лібэралаў. Яны пераканалі сябе, што толькі яны хочуць людзям дабра, і разам з усімі іншымі партыямі адмовілі і ўсё ранейшае жыцьцё. Яны прыступілі да ўніфікацыі – "единообразия", падгонкі ўсяго жыцьця пад некалькі сваіх простых формулаў. А адбылося гэта таму, што яны фэтышызавалі не камунізм (які для Лукашэнкі, напрыклад, так і застаўся ўтопіяй), а марксаў шлях да камунізму, які аказаўся памылковым і завёў не туды. Цяпер гэта прызнаюць і яны самі. Яны – камуністы без камунізму. Але амбіцыі не дазваляюць ім прызнаць сваю паразу. Імпэрыялістычны Захад будзе аплочваць ім дэмілітарызацыю, даваць грошы на адбудову эканомікі, на закрыцьцё ЧАЭС, на культурныя і адукацыйныя праграмы, слаць гуманітарную дапамогу (заўваж, што ўсё гэта чысты "камунізм", і паводле сваёй "зьвярынай" сутнасьці Захад гэтага рабіць якраз не павінен) – так як багаты сусед дапамагае нядбайлу, а яны будуць браць гэта ўсё і бурчэць, што мала, што Захад дае з каварнымі мэтамі, будуць хваліць Гітлера (бо ён таксама – уніфікатар)...

Сфармуляваная інтэлектуалам камуністычная мара рассыпалася ў руках чвэрцьінтэлігента, была зьведзеная да двух-трох пунктаў. Такую дэградацыю спазнала некалі і нацыянальная ідэя, спрошчаная да нацызму. Жыцьцё людзей не пераносіць спрашчэньняў, бо сам чалавек – надзвычай складаная сістэма. Ня менш складанае і ўзаемадачыненьне людзей у грамадзтве. Гэтага не захацелі або не змаглі зразумець ані нямецкія фашысты, ані савецкія камуністы, ня можа зразумець і чвэрцьінтэлігент Лукашэнка. Паіхнаму, ёсьць два класы і – пачынаем класавую барацьбу. Брэк-бокс. Вось і ўся тэорыя, і ўся практыка.

На маю думку, Беларусі патрэбныя проста мудрыя палітыкі, а не практыкі-мудрылы. Нам патрэбны беларускі палітычны цуд, беларускае эканамічнае дзіва, а не беларуская чуда, якое мы маем у абліччы першага прэзідэнта. Ня дзіва, што спаміж усіх камуністаў, якія прыйшлі цяпер да ўлады, мы ня знойдзем ніводнага, якога без аглядкі маглі б назваць мудрым. Бо мудры адрозьніваецца тым, што мысьліць не двума-трыма фактарамі, а ўсім спэктрам праяваў і сітуацый жыцьця.

Новая кніжная сэрыя

У Беларусі зьявіліся кнігі першай айчыннай сэрыі, разьлічанай на поўную самаакупнасьць

Сэрыя мае назву "Сучасная літаратура" і прадстаўляе ўжо постсавецкіх і ўжо дастаткова вядомых у нас і за мяжой аўтараў. Кнігі выкананыя ў сучасным дызайне і разьлічаныя на поўную самаакупнасьць. Новая сэрыя – суполны праект выдавецтваў "Літаратура" і "Наша Ніва".

– Такія кнігі цалкам нетрадыцыйныя для беларускай літаратуры, – кажа рэдактар "Сучаснай літаратуры" Сяргей Паўлоўскі. – Наша задача – выйсьці на айчынны кніжны рынак, які сёньня запоўнены нізкапробнай расейскамоўнай прадукцыяй. Для гэтага трэба ня толькі падрыхтаваць і выдаць кнігі (якія, дарэчы, мы друкуем у Варшаве, што выходзіць і таньней, і больш якасна), але стварыць цэлую сістэму рэкламы і рэалізацыі. Наш дзяржаўны кніжны гандаль, на жаль, не зацікаўлены ані ў прыбытках, ані ў правядзеньні кніжнай палітыкі.

Першае выданьне сэрыі – зборнік інтымнай прозы Адама Глёбуса "Толькі не гавары маёй маме..." Гэта ўжо шостая кніга пісьменьніка, чые выданьні маюць у Беларусі нязьменны посьпех.

– Сьледам за А.Глёбусам выйдуць з друку яшчэ дзьве кнігі, – працягвае С.Паўлоўскі, – пасьля чаго за выручаныя грошы мы зможам паўтарыць тыражы і рыхтаваць наступныя кнігі. Вядома, што мы будзем падбіраць толькі тыя кнігі, якія могуць рэальна прэтэндаваць на самаакупнасьць. Яны павінны быць чытэльныя, прыдатныя для рэцэнзаваньня і рэкламы, "канвэртабельныя", г.зн. іх можна будзе рэкамэндаваць для перакладу на іншыя мовы. Мы маем цэлы шэраг такіх крытэрыяў адбору і патрабаваньняў – у першую чаргу да сябе, да выдавецтва. Бо калі мы спрацуем добра, то пад шыльдай сэрыі цалкам можа зьявіцца і інтэлектуальная проза і нават паэзія. Галоўнае, каб гэта была ва ўсіх сэнсах сучасная літаратура.

Пашыранае ў такіх выпадках пытаньне пра беларускую мову, як "перашкоду" ў рэалізацыі выданьняў, у "Сучаснай літаратуры" ня ставяць. Маўляў, добрая, добра выдадзеная і добра пададзеная беларуская кніга заўсёды прадавалася ў Беларусі вялікімі тыражамі. На жаль, пакуль гэта былі хутчэй выключэньні.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

Куды пайсьці на сьвяты

Як зазначыў на мінулым тыдні музыка Лявон Вольскі, беларус павінен браць актыўны ўдзел у сьвятах, што прапануе жыцьцё. Таму кожны наш дзень мусіць быць напружаным у плане адпачынку. Такім чынам, куды пайсьці і што рабіць у сьвяточныя дні і вечары?

Усё лепшае – дзецям!

Дзіцячых імпрэзаў хопіць на любы густ.

29 сьнежня а 13 гадзіне пачынаецца імпрэза для даволі забясьпечаных (кошт квітка – 150 тыс. рублёў). За гэтыя грошы вядомае *Макс-шоў* у кінатэатры "Кастрычнік" гарантуе добры лялечны тэатар з Масквы, шакаладныя ласункі і багаты выбар печыва, а таксама Дзеда Мароза са Сьнягуркай і карнавал.

Альтэрнатыўны тэатар прапануе штораніцы **з 30 сьнежня да 10 студзеня** спэктакаль пад назваю "Баль Папялушкі" па казках Я.Шварца і Ш.Пэро. Адрас тэатру: вул. Веры Харужай, 31. Тэлефон 68-69-02.

Маладзёжны тэатар прэзэнтуе **29 і 30 сьнежня, а таксама з 2 да 5 студзеня** прыгожую казку Дональда Бісэта "Забыты дзень народзінаў". Забаўляць гледачоў будуць Дзед Мароз і 7 вясёлых гномаў. Пачатак спэктакляў аб 11 ды а 14 гадзінах. Адрас тэатру: вул. Даймана, 1. Тэл. 34-26-13.

Падлеткі могуць наведаць *Дом афіцэраў*, дзе **з 29 сьнежня да 6 студзеня** адбудуцца імпрэзы пад назваю "Таямніцы Навагодняга каляндара" з удзелам акцёраў Санкт-Пецярбургу. Абяцаюць скокі, жарты, шарады, загадкі. Пачатак штодня ў 10.30 і 13.30. Кошт квітка – 10 тыс. рублёў. Тэлефон 27-77-42.

Тэатар музкамэдыі прапануе мюзычныя казкі для дзяцей: **2 студзеня** "Залатое кураня", **3-4 студзеня** "Стойкі алавяны салдацік" (фэерыя ў 2-х дзеях), **5 студзеня** "Гісторыя Кая і Герды". Даведкі па тэлефоне 26-45-54.

У Купалаўскім тэатры **29, 30 сьнежня аб 11-й** можна паглядзець спэктакаль "Сьнежная каралева" па казцы Яўгена Шварца (пераклад на беларускую мову Ю.Гаўрука). Кошт квіткоў – ад 2 да 5 тыс. рублёў.

У Канцэртнай зале Дзяржаўнае філармоніі пройдзе казка паводле п'есы Маршака "12 месяцаў" з удзелам студэнтаў эстраднага аддзяленьня Інстытуту Культуры. Пачатак **31 сьнежня і 1 студзеня а 13 гадзіне, 2 і 3 студзеня – а 10 ды 13 гадзіне, з 4 да 8 – а 10, 13 ды 16 гадзінах.**

У Тэатры Юнага Гледача навагоднія імпрэзы пройдуць **з 29 сьнежня да 9 студзеня**. Кошт квіткоў – 5–7 тыс. рублёў. **Пачатак аб 11 ды 13 гадзінах.** Даведкі па тэлефоне 26-01-67.

У цырку **з 29 сьнежня да 14 студзеня** ідзе праграма "Цырк ліліпутаў. Зьзяньне маленькіх зорак". Акрамя таго – "Мядзьведзеў лабірынт" (мішкі-жанглёры ды мішкі на роварах), арыгінальныя акрабаты Султана Аталяна, джыгіты Асэтыі, дрэсаваныя поні ды сабачкі. **Пачатак у 11.30, 15.00 ды 19.00 гадзінаў.** Даведкі па тэлефоне 27-78-42.

Канцэрты

29 сьнежня а 19-й у памяшканьні *Тэатра музычнае камэдыі* адбудзецца Навагодні гала-канцэрт Канцэртнага аркестру Міхаіла Фінберга. У канцэрце бяруць удзел Іна Афанасьева, Валеры Дайнэка, Тато Майсурадзэ, Анжаліка Ют ды шмат хто іншы. Квіткі прадаюцца, сьпяшайцеся!

29 сьнежня *у Канцэртнай зале філармоніі* пройдзе вечарына, прысьвечаная 5-годзьдзю фонду "Дзецям Чарнобыля". У імпрэзе бяруць удзел Дзяржаўны сімфанічны аркестар (дырыжор В.Собалеў), салісты В.Чарнабаеў (бас), Вікторыя Мазур (сапрана), навучэнцы Менскае харэаграфічнае вучэльні, ансамбль традыцыйнага джазу "Рэнэсанс", Камэрны аркестар Акадэміі Музыкі. Імпрэза для людзей з асаблівым вытанчаным густам.

Тэатры

У Опэрным тэатры **30 сьнежня** пройдзе прэм'ера спэктаклю С.Картэса "Візіт старой дамы" па п'есе Ф.Дзюрэнмата. Рэжысура М.Пінігіна, лібрэта У.Халіпа, музыка З.Марголіна.

Тэатар музкамэдыі прапануе: **2 студзеня** апэрэту Ёгана Штраўса "Лятучая мыш" ("Жанчына-кажан"), **3 студзеня** "Сільва" Імрэ Кальмана, **4 студзеня** "Марыца" І.Кальмана, **5 студзеня** "Ноч у Вэнэцыі" Ёгана Штраўса. **Пачатак а 19-й гадзіне.**

Нацыянальны тэатар імя Янкі Купалы прэзэнтуе: **3 і 4 студзеня** камэдыю паводле М.Задорнава "Таполёвая завея", **4 студзеня** "Лес" паводле А.Астроўскага, **6** – камэдыю ў 2-х дзеях "Саўдзельнікі". Пачатак спэктакляў **а 19-й гадзіне.**

Тэатар сатыры і гумару "Хрыстафор" у ДК прафсаюзаў **2 студзеня** дае спэктакль "Трэцім будзеш?", **4** – "Кавалеры запрашаюць дамаў" (шансанье Анатоль Длускі), **5** – "М і Ж", а **6**-га "Хто каго?". Аўтар усіх п'есаў – У.Пярцоў. Спэктаклі пачынаюцца **а 19-й гадзіне.**

У Рускім драматычным тэатры ідуць наступныя спэктаклі: **2 студзеня** – "Адзіны спадкаемца", **3** – "Хто твой каханак, Жазэфа?", **4** – "Мадам, мёсье" і 6-га "Пэрэта". **Пачатак а 19-й гадзіне.** Адрас тэатру: вул. Валадарскага, 5.

Выставы

У Беларускай мастацкай галерэі дзейнічае выстава жывапісца-мануманталіста Аляксея Зінчука; дэманструюцца партрэты, краявіды ды цыкал твораў паводле Бібліі.

У Дабрачынным габрэйскім фондзе Менска выстаўленыя творы мастачкі Тацяны Ханінай: партрэты славутых дзеячоў Беларусі, цыкал "Гарадзкія краявіды".

У Нацыянальнай бібліятэцы ў аддзеле беларускай літаратуры адчынілася выстава кнігаў, прысьвечаных Слуцкаму збройнаму чыну; выстаўлена каля 40 рэдкіх экспанатаў.

Падзеі

7 студзеня *ў Тэатры опэры і балету* адбудзецца ўрачыстая цырымонія уручэньня прызоў "Чалавек года". Прызы устаноўленыя Мітрапалітам Філарэтам, Міністэрствам культуры, фірмаю "Хэлен Валеры". "Чалавекі" 1995 года атрымаюць прызы па 7 намінацыях: музыка, літаратура, мастацтва, палітыка, спорт, духоўнае адраджэньне, выяўленчае мастацтва. У цырымоніі зьбіраюцца браць удзел Канцэртны аркестар Фінберга, аркестар Тэатру опэры і балету, а таксама зоркі расейскай эстрады І.Панароўская ды Валеры Меладзэ. Уваход толькі па запрашальніках.

Панядзелак 1 студзеня

Белорусское телевидение
8.05 "На ледяной арене", ф/к
8.35 "История о принцессе-пастушке и ее верном коне Фаладе", х/ф
9.55 Телебом
10.15 Студии "Калыханка" – 15 лет
11.05 Мультиклуб
11.30 Премьер-кино
12.20 Золотые ключи
13.50 Маятник
14.40 "Реквием по любви", спект.
15.35 Белорусскому телевидению – 40 лет
16.25 Белорусский дом
16.55 Белорусскому телевидению - 40 лет
17.45, 21.45 "Театр", х/ф
18.55 И звезда с звездою говорит...
20.40 Колыбельная
21.00 Новости
23.00 Волчок-шоу
24.00 Акколада

ОРТ
5.30 Телеутро
8.00, 14.00, 17.00, 23.05 Новости
8.15 Мультитроллия
9.00 "Снежная королева", х/ф
10.25 Смак
10.45 Играй, гармонь!
11.15 Звездный час
12.00 "Освободите Вилли", х/ф
14.20 Песня-95
17.20 Ералаш
18.00 Угадай мелодию
18.45 Юбилейный вечер Г.Хазанова
19.50 Спокойной ночи, малыши!
20.00 Время
20.45 Юбилейный вечер Г.Хазанова
21.50 "Птичка на проводе", х/ф
00.00 Ралли Париж – Гранада – Дакар

Канал "Россия"
8.10 Теремок
8.25 "Одиссея"
9.10 "В поисках капитана Гранта", х/ф
10.15 Первый дубль
10.45 "Жил-был лис", д/ф
11.40 Клип-антракт
11.45 Три богатыря
12.30 Ретро-шлягер
13.00, 19.00, 22.00 Вести
13.25 "Начало", х/ф
14.55 Де факто
15.10 В мире животных
16.05 Параллели
16.20 Устами младенца
17.05 Про водку
18.05,19.25 "Золотые годы", с.5,6
20.25 "Капитан Пронин – внук майора Пронина", мульт.
20.35 "Умереть от счастья и любви", мюзикл
22.30 Бархатный голос Фрэнка Синатры
23.55 Река времени
24.00 "Новый Одеон", х/ф
1.15 Автомиг

Санкт-Петербург
9.05 Стиль жизни
9.20 "Красивая, но опасная", х/ф
11.05 Музыкальный момент
11.10 "Сердца трех", х/ф
12.55 Бенефис Екатерины Максимовой
14.30 Ювелирные шедевры Эрмитажа
15.00 Без названия
15.25 Детское ТВ
16.10 Новогодье
16.40 В доме кино звезды театра и эстрады
18.10 Большой фестиваль
18.30, 21.00 Информ ТВ
18.50 "Ты у меня одна", х/ф
20.25 Звезды на "бис"
21.20 День рождения
21.30 "Психоавантюра", х/ф
23.00 Телекомпакт
23.40 "Карамболина-Карамболетта", ф/к

IV канал, НТВ
7.15 Мультфильм
7.50 Грош в квадрате
8.20 Детская площадка
9.10, 10.35, 16.00 В гостиной Семейного канала
9.35 Уральский сказочник
10.30, 13.30, 16.45 СИВ
11.05 Время, портреты, судьбы
11.20 Цыганские напевы
12.00 Современные мемуары
13.00 Музучет
13.35 "Гостья из будущего",х/ф,с.1
14.40 "Заколдованный круг"
17.05 Мультканикулы
17.30 Сто к одному
18.00 Сегодня
18.35 Вернисаж Ильи Резника
19.10 "Робот-полицейский", х/ф
21.00 Лучшие шоу Бенни Хилла
21.20 "Стрелец неприкаянный",х/ф
23.00 Музыкальные премии года "Грэмми-95"

8 канал
18.00 "Беллисима"
18.45 "Пострелята"
19.15 "Дерзкие и красивые"
19.45 Городские часы
20.00 Музыкальная программа
20.45 Вечарніца
21.00 "Династия"
22.00 По ту сторону закона
22.30 "Опасный свидетель", х/ф

Аўторак 2 студзеня

Белорусское телевидение
7.30 Утренний коктейль
7.50 "Павел Луспекаев", х/ф
9.00 Мультфильм
9.30 Все про все
9.50 Мультиклуб
10.15 Бездельник
10.45 Профилактика сахарного диабета
11.00 "Поражение", х/ф, с. 1
12.30 "...А также цирк", ф/к
13.15 Авто-парк
13.30 Видимо-невидимо
14.30 Мультфильмы
15.00 Новости
15.15 Торговый дом
15.30 Мультфильмы
16.05 Родовод
16.35 На добрый лад
16.50 Колесо времени
17.20 Уроки Н.Новожиловой
17.50 Музыкальный антракт
18.00 Мастерская
18.25 Экономикст
18.35 MTV
18.50 Новости
19.05 Вертикаль
19.40 "Вестгейт", телесериал
20.40 Колыбельная
21.00 Панорама
22.00 Музыкальный антракт
22.10 "Прохиндиада-2", х/ф
23.50 Телеанонс
24.00 Новости
0.15 Футбол. Чемпионат Англии. "Мидлсбро" – "Астон Вилла"

ОРТ
6.30 Телеутро
8.00, 14.00, 17.00, 23.05 Новости
8.15 Мультитроллии
8.55 "Птичка на проводе", х/ф
